Новыя правы мігрантаў

Што рабіць з трухлявым домам?

Як у глыбінцы змагаюцца са злачыннасцю

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

25 ЛІСТАПАДА 2015 г. СЕРАДА № 228 (28086) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

СТАР.2

ВЫВЕСЦІ СПОРТ НА БОЛЬШ ВЫСОКІ ЎЗРОВЕНЬ

Як гэта зрабіць — абмяркоўвалася на нарадзе ў Прэзідэнта

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў выбудаваць адзіную эфектыўную сістэму падрыхтоўкі рэзерву спартсменаў для нацыянальнай зборнай па хакеі. Гэта тэма сярод іншых абмяркоўвалася на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы, якая была прысвечана пытанням развіцця хакея ў Беларусі, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта тэма абмяркоўваецца не ўпершыню. «Гэтаму віду спорту ў нас у краіне надаецца вялікае значэнне, яго любяць балельшчыкі», — заўважыў ён.

Разам з тым Прэзідэнт выказаў занепакоенасць у сувязі з існуючай сітуацыяй у гэтым відзе спорту. «Тое, што цяпер адбываецца ў названай сферы, насцярожвае, і ўжо даўно пара ўважліва разабрацца з усімі аспектамі гэтай праблемы. Так проста быць не павінна. Калі гэта будзе прадаўжацца, то ў найкарацейшыя тэрміны будуць прыняты самыя радыкальныя меры», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што аб гэтай сустрэчы папрасілі некаторыя з прысутных на нарадзе. «Я далёкі ад таго, каб мы сёння разгледзелі нейкія прынцыповыя пытанні. Думаю, што на маім узроўні, на ўзроўні дзяржавы яны ўсе вырашаны. Можа, ёсць нейкія праблемы больш дробныя. Калі ласка, я гатовы да іх абмеркавання», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Што датычыцца «Дынама», то мы ідзём ад лепшага да горшага як мінімум. Такая гульня, што сёння можам выйграць з розніцай 5 шайбаў, а заўтра з такой жа розніцай прайграць па сіле такой жа камандзе, як учора, нікуды не варта. Няма ніякай стабільнасці», — выказаў незадавальненне кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым ён нагадаў: дзяржава ўклала немалыя грошы, каб хакей развіваўся, і мае права чакаць належнай аддачы. «У дзяржавы няма лішніх грошай, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Пара пераходзіць на акупнасць, самаакупнасць. Ёсць клубы, няхай зарабляюць грошы. Што зарабілі, няхай трацяць згодна з тымі законамі, якія ёсць у краіне. А падтрымка будзе скарачацца, як гэта было прынята ў адпаведнасці з маімі рашэннямі».

Старшыня Федэрацыі хакея Ігар Рачкоўскі далажыў аб сітуацыі ў гэтым відзе спорту, у тым ліку аб падрыхтоўцы да чэмпіянату свету 2016 года ў Расіі, аб фарміраванні і функцыянаванні нацыянальнай зборнай па хакеі. «Сёння вострых і праблемных пытанняў няма. Адзіную непрыемную сітуацыю нам «падарылі» нашы расійскія калегі, калі пасля старту ў КХЛ быў зменены рэгламент спаборніцтваў у частцы легіянерскага статусу беларусаў. І гэта нягледзячы на цвёрдыя запэўненні міністра спорту Расіі і кіраўніка Федэрацыі хакея Расіі, што такой сітуацыі ў бліжэйшыя гады не адбудзецца. Да вырашэння гэтай праблемы мы падключылі нават прэзідэнта Міжнароднай федэрацыі хакея Рэнэ Фазеля і дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Рыгора Рапоту, які накіраваў у адрас Міністэрства спорту Расіі пісьмо аб недапушчальнасці такіх дзеянняў», — расказаў Ігар Рачкоўскі.

Акрамя таго, на нарадзе абмяркоўвалася прапанова Федэрацыі хакея аб правядзенні ў Мінску чэмпіянату свету 2022 года.

Прэзідэнт у час нарады асаблівую ўвагу ўдзяліў пытанням падрыхтоўкі рэзерву для нацыянальнай зборнай па хакеі, прычым без стварэння дадатковай інфраструктуры. Гэта сістэма не павінна быць канцэптуальна новай, размова ідзе толькі аб дакладнай сістэматызацыі работы. А за аснову будзе ўзяты лепшы замежны вопыт, напрыклад, канадскі.

На нарадзе разглядаліся і іншыя праблемы, вырашэнне якіх дасць магчымасць узняць на больш высокі ўзровень падрыхтоўку будучых зорак хакея. Напрыклад, адно з прынятых на ўзроўні Прэзідэнта рашэнняў — будаўніцтва арэнднага жылля для маладых трэнераў, якія працуюць з таленавітымі спартсменамі. Ключавое патрабаванне кіраўніка дзяржавы — апірацца трэба на айчынныя спартыўныя таленты. Важна толькі ўмець іх знайсці і належным чынам падрыхтаваць.

Пытанні далейшага развіцця хакея разглядаліся ў комплексе. Напрыклад, прынята рашэнне, што пачынаючы з гэтага або наступнага квартала важнейшыя спартыўныя функцыянеры ў хакеі будуць назначацца толькі па ўзгадненні з Федэрацыяй хакея.

Сур'ёзную ўвагу Аляксандр Лукашэнка ўдзяліў і тэме загружанасці спартыўных аб'ектаў, развіццю масавага спорту. Прэзідэнт запатрабаваў эфектыўных рашэнняў і падыходаў, дзякуючы якім удасца вывесці беларускі спорт на больш высокі ўзровень.

У час нарады разглядаліся праблемы, вырашэнне якіх дасць магчымасць узняць на больш высокі ўзровень падрыхтоўку будучых зорак хакея. І хоць асноўнай тэмай нарады было развіццё хакея, фактычна закраналіся праблемныя пытанні ва ўсіх відах спорту.

АФІЦЫЙНЫ ВІЗІТ ПРЭЗІДЭНТА Ў РАСІЮ ПЕРАНЕСЕНЫ

У сувязі з загружанасцю працоўных графікаў прэзідэнтаў Беларусі і Расіі ўзгоднены перанос афіцыйнага візіту кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі ў Расію. Пра гэта БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Канкрэтныя тэрміны візіту будуць узгоднены па дыпламатычных каналах.

Гуляў Міхайла па Міхайлаўцы

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзень, які ў народзе называюць Міхайлам, стаў для жыхароў вёскі Міхайлаўка Светлагорскага раёна святочным. Асабліва для 85-гадовай **Лідзіі БЕЛАЙ** (на здымку яна са сваімі ўнукамі Ксеніяй і Мікалаем): нарэшце, яна дачакалася ікону архангела Міхаіла — галоўную святыню вёскі. Жанчына верыла і чакала шчаслівага моманту, калі нябесны апякун Міхайлаўкі прыйдзе ў яе дом. Здавалася, у атэістычныя гады можна было назаўсёды пахаваць гэтую «крамольную» мару, але перарваная традыцыя пераносіць ікону з хаты ў хату зноў вярнулася ў вёску.

— Гэта сапраўдны цуд! — хвалюючыся, паўтарае баба Ліда.

Ужо дваццаць адзін год святыня вандруе па міхайлаўскіх хатах, дае вяскоўцам веру і надзею, нясе радасць і суцяшэнне. Пра тое, як жыхары вёскі ўшаноўваюць сваю старажытную традыцыю і чаму Лідзія Белая так чакала ікону з выявай архангела, **чытайце на 8-й старонцы.**

ЛІЧБА ДНЯ

Br6 млн 646,5 тыс.

склала намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў Беларусі ў студзені—кастрычніку гэтага года, у тым ліку ў кастрычніку — Br6 млн 837,6 тыс. Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Паводле аператыўных даных, у кастрычніку ў прамысловасці сярэдняя заработная плата склала Br7 млн 325,4 тыс., у будаўніцтве — Br8 млн 263,5 тыс., на транспарце і ў сувязі — Br7 млн 749,9 тыс., у сельскай і лясной гаспадарцы — Br4 млн 913 тыс., у адукацыі — Br4 млн 899 тыс., у тым ліку настаўнікаў — Br5 млн 926,7 тыс., прафесарска-выкладчыцкага складу — Br8 млн 14 тыс.

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 25.11.2015 г.

Долар ЗША	18042,00	▲
Еўра	19185,00	▲
Рас. руб.	274,94	▲
Укр. грыўня	753,71	▲

■ Нацыянальны адпачынак

СЕЛЬСКІ ТУРЫЗМ: СТВОРЫМ КРАІНЕ ІМІДЖ

Агратурызм імкліва набірае вялікую папулярнасць ва ўсім свеце. У тым ліку і ў нашай краіне. Шматлікія турысты, і замежныя, і нашы, ахвотна наведваюць беларускія сядзібы, дзе далучаюцца да культуры, рамёстваў, актыўнага адпачынку і нацыянальнай кухні. Адпачынак у вёсцы ўваходзіць у моду таксама і сярод моладзі, якая цікавіцца гісторыяй, спадчынай продкаў. Сельскі і экалагічны турызм развіваецца ў краіне ўжо на працягу дзесяці гадоў. Тое, што сёння маюць беларусы ў агратурызме і куды нам варта ў гэтым напрамку рухацца далей, абмяркоўвалі з беларускімі экспертамі спецыялісты з Латвіі, Літвы, Славакіі, Украіны, Расіі і Казахстана.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У нашу вёску едуць нават з Аўстраліі!

Аграрны турызм адзін з найбольш перспектыўных для развіцця эканомікі краіны. Гэты напрамак здольны прыцягнуць немалую валютную выручку, стварыць новыя працоўныя месцы ў сельскай мясцовасці. Але самае важнае тое, што агратурызм стварае гісторыка-культурны імідж дзяржавы. Сёння ў нашай краіне налічваецца больш за 2 тысячы сельскіх сядзіб. Для параўнання, 10 гадоў таму іх было ўсяго толькі 23. Дзясяткі тысяч турыстаў штогод атрымліваюць магчымасць адкрыць Беларусь з новага боку, бо ўсе сядзібы маюць індывідуальны падыход да кліента. Нават самаму пераборліваму наведвальніку тут могуць знайсці занятак у любую пару года. На нашых сядзібах можна і парыбачыць, і правесці вечар ля каміна, пазбіраць грыбы і ягады. Ёсць магчымасць і пачаставацца найлепшымі стравамі беларускай кухні. СТАР. 2

■ Глыбінка

«САДОК» — БАБУЛЯМ, «УНІВЕРСІТЭТ» — АСАБЛІВЫМ ЛЮДЗЯМ

Пажылыя жанчыны з глыбінкі і на пенсіі вядуць актыўны лад жыцця. Яны наведваюць гурткі па інтарэсах, займаюцца на трэнажорах, збіраюць калекцыю прадметаў даўніны. А яшчэ дапамагаюць супрацоўнікам аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў працаваць з людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі. У незвычайнай установе пабываў карэспандэнт «Звязды».

У гарадскім пасёлку Ветрына Полацкага раёна ў двухпавярховым будынку працуюць «дзіцячы садок» для пенсіянераў, «універсітэт» для інвалідаў і цэнтр па аказанні сацыяльных паслуг.

— У Ветрына знаходзяцца тры аддзяленні: дзённага знаходжання грамадзян пажылога ўзросту, тэрміновага сацыяльнага абслугоўвання, дзённага знаходжання для інвалідаў. Каму з інвалідаў нязручна да нас дабірацца, прывозім на заняткі на аўто. Ёсць і такія «студэнты», якім супрацьпаказана пакідаць дом. Дык кіраўнікі гурткоў рукадзелля да іх прыязджаюць. Гэта робіцца ў рамках праекта «Ляцім на дапамогу». Яго эмблема — пчолка... — распавядае Святлана Касьянава, дырэктар дзяржаўнай установы «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Полацкага раёна». І паказвае кветнікі, цяпліцы, дзе арганізуецца працатэрапія для «асаблівых» людзей. СТАР. 4

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Су-24 пацярпеў крушэнне ў Сірыі. НАТА правяла экстранную нараду

Як паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на Мінабароны Расійскай Федэрацыі, самалёт Су-24 пацярпеў крушэнне ў Сірыі. У абаронным ведамстве расказалі, што самалёт расійскай авіягрупы пацярпеў крушэнне, як мяркуецца, у выніку абстрэлу з зямлі. Ён ляцеў на вышыні 6 тысяч метраў. Пілотам, па папярэдніх звестках, удалося катапультавацца. Згодна з некаторымі паведамленнямі на інтэрнэт-рэсурсах, адзін з пілотаў загінуў. Лёс другога невядомы. У Мінабароны Расіі пацвердзілі, што Су-24 не парушаў паветранай прасторы Турцыі. Увесь час палёту самалёт знаходзіўся выключна над тэрыторыяй Сірыі. Гэта зафіксавана аб'ектыўнымі сродкамі кантролю. Абставіны падзення расійскага самалёта высвятляюцца. Раней СМІ паведамлялі, што турэцкія ВПС збілі неапазнаны самалёт. Па версіі турэцкага боку, самалёт увайшоў у паветраную прастору Турцыі з боку Сірыі, пасля чаго турэцкія самалёты F-16 па прынятых у рэспубліцы правілах рэагавання збілі яго. У сувязі з падзеннем расійскага бамбардзіроўшчыка Су-24 на тэрыторыі Сірыі, НАТА ўчора ўвечары правяла экстранную нараду. Пасяджэнне праводзілася на ўзроўні паслоў, ніякіх мерапрыемстваў для прэсы не прадугледжвалася. Тым часам у МЗС Вялікабрытаніі назвалі інцыдэнт з падзеннем Су-24 «вельмі сур'ёзным». У ААН раней заявілі, што сітуацыя са збітым расійскім самалётам можа ўскладніць барацьбу з тэрарызмам на тэрыторыі Сірыі.

У Егіпце ўзарваліся дзве бомбы

Дзве бомбы падарваліся ў Егіпце па-за межамі гатэля, у якім былі размешчаны члены выбарчай камісіі. Як паведамляе егіпецкае дзяржаўнае тэлебачанне, загінуў адзін чалавек. Выбухі ў горадзе Эль-Арыш адбыліся на наступны дзень пасля завяршэння другога тура парламенцкіх выбараў. Пакуль ніхто не ўзяў на сябе адказнасць. Сайт ThemaNews паведамляе, што, прынамсі, адна бомба знаходзілася ў аўтамабілі. Галасаванне, якое павінна было вызначыць, хто зойме 596 месцаў у парламенце, праходзіла на фоне росту гвалту і тэрарызму ў краіне. Тэлеканал Аль-Арабія паказвае на шматлікія сведчанні аб подкупе і іншыя парушэнні падчас выбараў.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Суперпрадукты пазбаўляюць ад тлушчавых адкладанняў

Гэта какосавы воцат, карыца, ламінарыя, малако з куркумой, гранатавы сок і пальмовы чай (піша The Daily Mail). Какосавы воцат вельмі падобны да іншых відаў воцату. Яго пераважна выкарыстоўваюць у кухні Паўднёва-Усходняй Азіі. У ім шмат мінеральных рэчываў (асабліва калію), якія дапамагаюць кантраляваць цукар і паскараюць абменныя працэсы. Дыетолагі раяць змяшаць адну сталовую лыжку воцату з цёплай вадой. Такім чынам атрымаецца «ранішні напой», з якога лепш пачынаць дзень. Альтэрнатыва — воцат можна дабаўляць у салаты. Карыца паскарае метабалізм і не дае ўтварацца тлушчавым адкладанням. А яшчэ яна зніжае ўзровень цукру, які звычайна павышаны ў поўных людзей. Карыцу можна дабаўляць у гарачыя напоі (чай, каву) або ў кашу. У сваю чаргу, ламінарыя — сапраўдная скарбніца рэчываў, якія паскараюць працэс стрававання, і ёду, што пазітыўна адбіваецца на абмене рэчываў. Малако з куркумой стымулюе выпрацоўку жоўці, а яна дапамагае расшчапляць ежу і пераварваць тлушчы. Куркума прадухіляе ўздуцце і газаўтварэнне. У гранатах шмат антыаксідантаў. А пальмовы чай выдатна выводзіць таксіны з цела і падтрымлівае здаровы абмен рэчываў. Аднак ім нельга злоўжываць.



ДА ВЕДАМА

ЯК БУДЗЕМ АДПАЧЫВАЦЬ У СВЯТЫ

Савет Міністраў Беларусі зацвердзіў графік пераносу рабочых дзён у 2016 годзе.

На праваслаўныя Каляды нас чакаюць чатырохдзённыя канікулы: выхаднымі будуць 7, 8, 9 і 10 студзеня. Працоўны дзень з пятніцы, 8 студзеня, пераносіцца на суботу, 16 студзеня. Таксама працоўны дзень з панядзелка, 7 сакавіка, пераносіцца на суботу 5 сакавіка. Што да гэтага года, то святкаваць каталіцкія Каляды і Новы год мы будзем па тры дні: 25 снежня і 1 студзеня прыпадаюць на пятніцу.

Арганізацыям прадастаўлена права з улікам спецыфікі вытворчасці (працы) ажыццяўляць перанос рабочых дзён у іншым парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Святлана БУСЬКО.

АЛЕ, ГАРАЖ!..

Прыстанак для «жалезнага каня» павінен быць бяспечным

У гаражах і гаражных кааператывах пажары здараюцца нячаста. Але ўрон, які яны прыносяць, можа быць каласальным з-за моцных пашкоджанняў аўтамабіля, што каштуе не адну тысячу долараў, не кажучы ўжо пра выдаткі на аднаўленне самога гаража. А можа да таго ж пацярпець і прыватны дом. У кааператывах агонь рызыкуе распаўсюдзіцца на гаражы, якія стаяць побач. Балазе гэтаму садзейнічае цесната і загрувашчанасць.

Зусім хутка надыдзе зіма. У гэты час года многія аўтааматары лічаць патрэбным часова прыпыніць эксплуатацыю свайго «жалезнага каня» да вясны: каб перавесці аўто на зімні лад, патрэбны дадатковыя капіталаўкладанні, ды і ўмовы бяспечнага кіравання ў цёмны час сутак і галалёд куды больш складаныя. І лепшае месца для «кансервацыі» аўтамабіля, чым гараж, знайсці складана. Як жа правільна трэба сябе паводзіць у такім месцы? Аб гэтым карэспандэнт «Звязды» папрасіў расказаць **памочніка міністра па надзвычайных сітуацыях Віталя НАВІЦКАГА.**

ПА АДЗІНЫХ ПРАВІЛАХ

— Ад ліпеня мінулага года ў краіне запрацавалі адзіныя Правілы пажарнай бяспекі, юрысдыкцыя якіх распаўсюджваецца і на гаражы. Раней жа даводзілася працаваць з вялікай колькасцю дакументаў, цяпер уся нарматыўная база стала ўніфікаванай.

Асноўная прычына, чаму гараць гэтыя пабудовы, — неасцярожнае абыходжанне з агнём. Гаворачы інакш, гаспадары аўтамабіляў займаюцца нейкімі рамонтнымі работамі ў гаражы, выкарыстоўваючы адкрыты агонь або электрычныя прыборы і не зважаючы пры гэтым на існуючыя нормы. СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

■ Экспарт

ГРАШОВА ПАДАЕ, А НАТУРАЛЬНА РАСЦЕ

Пры зніжэнні якасных паказчыкаў экспарту назіраецца рост продажу ў фізічных аб'ёмах

Мер, што прымаюцца па нарошчванні экспарту і пошуку новых рынкаў збыту, пакуль недастаткова. Такую думку выказаў прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў. Сёння перад краінай ставіцца задача актуалізацыі новых рынкаў у адпаведнасці з эканамічнай мэтазгоднасцю.

Маем станоўчае сальда на ўзроўні 1,2 млрд долараў

Па выніках студзеня—верасня 2015 года экспарт тавараў і паслуг склаў 75,4% да аналагічнага перыяду летась. Кіраўнік беларускага ўрада звярнуў увагу на тое, што неабходна далейшая канцэнтрацыя намаганняў у гэтым кірунку. Андрэй Кабякоў таксама адзначыў, што пры зніжэнні вартасных паказчыкаў экспарту з прычыны неспрыяльнай знешняй кан'юнктуры цэн па шэрагу таварных пазіцый назіраецца значны рост продажу ў фізічных аб'ёмах. Напрыклад, гэта тычыцца нафтапрадуктаў, малака і вяршкоў, сыроў і тварагу. Кіраўнік урада канстатаваў, што экспарт тавараў на новыя перспектыўныя рынкі працягвае дэманстраваць станоўчую дынаміку. Ён склаў 664 млн долараў, або 118,4% да ўзроўню студзеня—верасня 2014 года. Андрэй Кабякоў падкрэсліў устойлівую тэндэнцыю фарміравання станоўчага сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі, якое па выніках дзевяці месяцаў склала 1,2 млрд долараў, або 2,9% ВУП. Адзначаецца таксама рост паставак на рынкі краін Азіі, Афрыкі.

«Экспарт у краіны Усходняй Азіі павялічыўся на 27,4%, у тым ліку ў Кітай на 37,8%. Пастаўкі ў Афрыку выраслі на 8,9%. Запатрабавана беларуская прадукцыя і ў дзяржавах Цэнтральнай і Паўночнай Амерыкі, экспарт вырас на 12,6%», — сказаў ён.

Час актуалізаваць новыя рынкі

Падчас пасяджэння Прэзідыума Саўміна **міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ** адзначыў, што прынятыя меры па падтрымцы экспарцёраў дазволілі мінімізаваць негатыўныя тэндэнцыі, звязаныя з экспартам тавараў і паслуг.

«У складаных знешніх эканамічных умовах для эканомікі аб'ёмы нашага экспарту маглі б быць і больш значнымі, але прынятыя меры членаў урада і службовых асоб па падтрымцы экспарцёраў дазволілі не дапусціць далейшага зніжэння экспарту, а таксама забяспечыць невялікі прырост пры станоўчым сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі», — сказаў Уладзімір Макей.

Пры гэтым ён падкрэсліў важнасць створанай знешнепалітычнай кан'юнктуры для паляпшэння выніковасці эканамічнага супрацоўніцтва.

«Суб'екты гаспадарання абавязаны скарыстацца гэтым для мэт дыверсіфікацыі экспарту, прыцягнення інвестыцый, стварэння новых вытворчасцей, выгаднага выкарыстання танных замежных крэдытных крыніц», — падкрэсліў міністр замежных спраў.

«Аб'ектыўна ацэньваючы працу службовых асоб па дыверсіфікацыі экспарту, можна сказаць, што механізм увогуле задзейнічаны і дае станоўчы эфект», — сказаў ён.

Уладзімір Макей лічыць неабходным актуалізаваць спіс новых перспектыўных рынкаў для экспарту беларускіх тавараў у адпаведнасці з эканамічнай мэтазгоднасцю.

«Дзеючы спіс краін, як мы бачым, не цалкам адпавядае чаканням экспарцёраў», — дадаў міністр.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Заканатворчасць

Андрэй НАУМОВІЧ:

«МІЖНАРОДНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ВЫСОКА АЦЭНЬВАЮЦЬ НАШЫ ДЗЕЯННІ ПА ПРЫЁМЕ ВЫМУШАНЫХ МІГРАНТАЎ»

Новая рэдакцыя міграцыйнага заканадаўства нашай краіны прадугледжвае, што замежнікі, якія маюць статус бежанца, атрымаюць роўныя з грамадзянамі Беларусі правы на медыцынскае абслугоўванне. Акрамя гэтага, пэўным групам вымушаных мігрантаў у нашай краіне прасцей будзе рэалізаваць сваё права на працаўладкаванне. Пра іншыя асаблівасці праекта закона «Аб унясенні змен і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях вымушанай міграцыі», супрацоўніцтва з міжнароднымі структурамі падчас падрыхтоўкі законапраекта, а таксама пра тое, ці ёсць выйсце з міграцыйнага крызісу, з якім сутыкнулася Заходняя Еўропа, карэспандэнту «Звязды» расказаў старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Андрэй НАУМОВІЧ.

— Законапраект паступіў у вашу камісію летам гэтага года. У чым заключаюцца асноўныя новаўвядзенні?

— Асноўная навацыя — укараненне адзінай працэдуры прыёму і разгляду хадайніцтва аб прадастаўленні статусу бежанца, дадатковай абароны або прыстанішча ў нашай краіне. Праект закона прадугледжвае прывядзенне некаторых прававых палажэнняў у адпаведнасць з Канвенцыяй 1951 года аб статусе бежанцаў, удзельніцай якой з'яўляецца і Рэспубліка Беларусь.

У прыватнасці, прапануецца ўраўнаваць з грамадзянамі нашай краіны замежнікаў, якім прадастаўлены статус бежанца, у праве на медыцынскае абслугоўванне. Прадугледжаны таксама змены, накіраваныя на садзейнічанне рэалізацыі правоў на працаўладкаванне замежнікаў, якія хадайнічаюць аб абароне, і замежнікаў, якім прадастаўлена дадатковая абарона ў Рэспубліцы Беларусь. Удакладнены парадак уз'яднання з сям'ёй іншаземцаў, якім дадзены статус бежанца, дадатковая абарона або прыстанішча.

— Якія змены былі ўнесены ў законапраект падчас яго абмеркавання?

— Для нас было вельмі важна правесці шырокае абмеркаванне законапраекта з удзелам міжнародных экспертаў, прадстаўнікоў навуковай супольнасці, грамадскіх арганізацый, каб паглядзець на праблематыку вымушанай міграцыі ў міжнародным кантэксце, абагуліць той вопыт у гэтай сферы, які ў нас ёсць, а таксама абмеркаваць магчымыя прапановы па ўдасканаленні нацыянальнай сістэмы прыёму і разгляду хадайніцтваў аб прадастаўленні статусу бежанца, дадатковай абароны або прыстанішча. Мяркуем, што ў выніку ўсіх гэтых дзеянняў мы зможам прапанаваць добры, якасны праект закона, які будзе адказваць сучасным выклікам.

У верасні гэтага года сумесна з Беларускім дзяржаўным універсітэтам быў арганізаваны «круглы стол» па пытаннях вымушанай міграцыі, шэраг іншых мерапрыемстваў. Такія абмеркаванні паказалі, што ўнесены ў Палату прадстаўнікоў законапраект падрыхтаваны на высокім прафесійным узроўні, адпавядае міжнародным абавязацельствам нашай краіны.

Натуральна, няма мяжы дасканаласці. У прыватнасці, ёсць шэраг прапаноў, накіраваных на дадатковую абарону правоў дзяцей, што падпадаюць пад дзеянне законапраекта. Але канцэптуальных заўваг не паступіла, і мы плануем улічыць прапановы, якія паступілі падчас падрыхтоўкі законапраекта да другога чытання.

— За гэты і мінулы год у нашу краіну прыбыло шмат бежанцаў. Ці даводзілася вам асабіста сустракацца з гэтымі людзьмі? Наколькі праект закона адпавядае іх патрэбам, жаданням?

— Спачатку вызначымся з тэрмінамі. У Рэспубліцы Беларусь статус бежанца даецца замежнаму грамадзяніну з-за таго, што той можа стаць ахвярай пераследаванняў у сваёй дзяржаве па прыкмеце расы, веравызнання, грамадзянства, нацыянальнасці, прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы або з-за палітычных перакананняў. З 1 студзеня мінулага года па 1 верасня гэтага статус бежанца ў нашай краіне атрымалі 38 чалавек, і сярод іх няма ніводнага грамадзяніна Украіны.

У той жа час існуе паняцце дадатковай абароны. У нашай краіне яна прадастаўляецца ў тым ліку замежным грамадзянам або асобам без грамадзянства, якія пры вяртанні ў сваю краіну могуць сутыкнуцца з пагрозай жыццю — па прычыне ўзброенага канфлікту.

З першага студзеня мінулага года па першага верасня гэтага года дадатковую абарону ў Беларусі атрымалі 896 чалавек, з іх 809 грамадзян Украіны.

Законапраект прадугледжвае больш поўную абарону правоў асоб, якія атрымалі статус бежанца або маюць патрэбу ў дадатковай абароне ў нашай краіне.

Безумоўна, падчас сустрэч у сваёй выбарчай акрузе я сустракаўся з перасяленцамі з Украіны. Усе яны ўдзячны беларускай дзяржаве і людзям за дапамогу ў няпростай сітуацыі. У сувязі з гэтым неабходна падкрэсліць своечасовасць Указа Прэзідэнта ад 30 жніўня мінулага года №420 «Аб знаходжанні грамадзян Украіны ў Рэспубліцы Беларусь». Указ прадугледжвае шэраг мер падтрымкі ў дачыненні да грамадзян Украіны, якія прыбываюць з Данецкай і Луганскай абласцей. Павінен таксама адзначыць, што прадстаўнікі міжнародных арганізацый, з якімі мне даводзілася размаўляць, вельмі высока ацэньваюць дзеянні беларускіх улад па прыёме на сваёй тэрыторыі перасяленцаў з Украіны.

— У нашай краіне працуе прадстаўніцтва Кіраўніцтва вярхоўнага камісара па справах бежанцаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (КВКБ ААН). Як ваша Камісія, другія распрацоўшчыкі праекта закона супрацоўнічаюць з гэтай арганізацыяй?

— Асноўнай мэтай працы Кіраўніцтва вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў з'яўляецца здзяйсненне і каардынацыя міжнародных дзеянняў па забеспячэнні абароны бежанцаў ва ўсіх кутках свету. Таму натуральна, што для беларускіх органаў улады КВКБ ААН з'яўляецца асноўным міжнародным партнёрам пры вырашэнні пытанняў, звязаных з забеспячэннем правоў вымушаных мігрантаў.

Мы вельмі ўдзячны прадстаўніцтву КВКБ ААН за значную экспертную дапамогу, якую атрымліваў і атрымлівае беларускі бок на працягу ўсяго перыяду працы над законапраектам. Пры гэтым такое супрацоўніцтва пачалося з самай першай стадыі падрыхтоўкі законапраекта — задоўга да яго паступлення ў парламент. Многія прапановы КВКБ ААН былі ўлічаны ўжо тады, некаторыя застаюцца на парадку нашай працы да гэтага часу.

— Сітуацыя з мігрантамі ў Заходняй Еўропе ўжо каторы месяц з'яўляецца балючай тэмай. На вашу думку, ці ёсць выйсце з яе — такое, якое будзе задавальняць і ўрады еўрапейскіх краін, і самі бежанцаў?

— Давайце паспрабуем разабрацца ў прычынах найбуйнейшага міграцыйнага крызісу ў Еўропе з часоў Другой сусветнай вайны. «Арабская вясна», якая прывяла да стварэння шматлікіх ачагоў нестабільнасці ў Паўночнай Афрыцы і на Блізкім Усходзе, войны ў Афганістане і Сірыі прымусілі сотні тысяч людзей шукаць прыстанішча ў Еўропе. Дадайце сюды людзей, якія імкнуцца трапіць у еўрапейскія краіны ў пошуках «лепшай долі». Мігранты, якія ўжо атрымалі ў Еўрапейскім саюзе легальны статус і ўжыліся ў новае асяроддзе, з'яўляюцца пунктамі прыцягнення для сваіх родзічаў і знаёмых. Менавіта таму сёння паток перасяленцаў дасягнуў сапраўды грандыёзных маштабаў. Гэта праблема не толькі павялічвае сацыяльную напружанасць у дзяржавах Еўропы, але і істотна абвастрае тыя супярэчнасці паміж асобнымі краінамі — членамі Еўрасаюза, якія былі дагэтуль.

Злучаныя Штаты і іх еўрапейскія саюзнікі пасеялі вецер арабскіх рэвалюцый і цяпер пажынаюць міграцыйную буру. Справіцца з гэтай «бурай» можна толькі калектыўнымі намаганнямі. Неабходна перастаць нарэшце правакаваць рэгіянальныя канфлікты, пачаць рабіць канкрэтныя дзеянні для зніжэння эканамічнага разрыву паміж Поўначчу і Поўднем.

«З 1 студзеня мінулага года па 1 верасня гэтага статус бежанца ў нашай краіне атрымалі 38 чалавек, і сярод іх няма ніводнага грамадзяніна Украіны».

— На гэтай сесіі праект закона будзе прымацца ў першым чытанні. Ці можна чакаць, што вясной ён будзе прыняты ў другім? Увогуле, гэта канчатковая рэдакцыя заканадаўства аб міграцыі ці праз некалькі гадоў узнікне неабходнасць у яго пераглядзе?

— Так, мы, натуральна, хацелі б разгледзець законапраект у першым чытанні на асенняй сесіі. Калі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў падтрымаюць прапанову аб прыняцці праекта ў аўтарскай рэдакцыі, мы будзем імкнуцца, каб другое чытанне адбылося ўжо вясной.

Што да магчымай карэкціроўкі ў будучыні, то адзначу, што любыя прававадносіны не стаяць на месцы: збіраецца вопыт прымянення, узнікаюць новыя ўмовы, змяняецца сітуацыя ў свеце — усё гэта патрабуе рэгулярнага перагляду існуючага заканадаўства, у тым ліку і ў сферы вымушанай міграцыі.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

■ Тры пытанні да ўлады

І ПЯЦЬСОТ ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАЎ

Завод па вытворчасці сульфатнай беленай цэлюлозы ў Светлагорску сёлета стаў другой па значнасці (пасля Астравецкай АЭС) будоўляй Беларусі. Старшыня Светлагорскага райвыканкама Віктар ДАРАШЭВІЧ упэўнены, што вытворчасць будзе запатрабаванай і ўжо сёлета адбудзецца адкрыццё прадпрыемства.

— Віктар Рыгоравіч, якія задачы ўрэшце павінен вырашыць гэты вялікі інвестыцыйны праект?

— Сёння ў Беларусі белая папера ўвогуле не выпускаецца, а патэнцыйных спажыўцоў такога прадукту вельмі многа. Таму, упэўнены, вытворчасць будзе запатрабаванай і рэнтабельнай. Плануецца, што завод зможа выпускаць 400 тысяч тон беленай цэлюлозы за год. Тры чвэрці з іх пойдзе на экспарт. Агульны кошт беларуска-кітайскага інвестыцыйнага праекта складае больш за $850 млн. Прыкладна $550 млн — крэдыт, выдадзены кітайскім банкам. Пастаўшчыком абсталявання выступае група кампаній Andritz (Аўстрыя), якая лічыцца сусветным лідарам абсталявання і паслуг для цэлюлозна-папяровай прамысловасці. На заводзе будзе створана дадаткова 500 працоўных месцаў. У якасці сыравіны для вытворчасці цэлюлозы будзе выкарыстоўвацца беларуская драўніна, а таксама адходы яе перапрацоўкі. Дарэчы, акрамя сульфатнай беленай, тут будуць вырабляць і віскозную цэлюлозу. Апошняя выкарыстоўваецца ў хімічнай прамысловасці для вытворчасці тканіны. Частка яе як сыравіна будзе выкарыстоўвацца ААТ «СветлагорскХімвалакно». Цяпер асноўныя будаўнічыя работы на новым прадпрыемстве завершаны, ідзе выпрабаванне тэхналагічнага абсталявання і падрыхтоўка да эксперыментальнага пуску завода. На поўную загрузку прадпрыемства выйдзе, магчыма, да сярэдзіны наступнага года. У рамках рэалізацыі гэтага інвестпраекта ў горадзе пабудаваны два маласямейныя інтэрнаты блокавага тыпу на 80 месцаў кожны, яны будуць уведзены ў эксплуатацыю ў снежні.

— Наколькі актуальнай для Светлагоршчыны з'яўляецца праблема забеспячэння медыцынскімі кадрамі?

— На працягу апошніх гадоў у раёне значна палепшылася сітуацыя. Дзякуючы рабоце па замацаванні на першым працоўным месцы практычна прыпыніўся адток маладых спецыялістаў з галіны. Вырашаецца адна з самых вострых і надзённых праблем — жыллёвая. Мы выдзяляем спецыялістам службовыя і арэндныя кватэры ў новых дамах. Іншагароднія забяспечваюцца інтэрнатам. За тры гады працэнт укамплектаванасці медкадрамі павялічыўся з 92,7% у 2012 годзе да 96% сёлета. Важна і тое, што цяпер актыўна мадэрнізуецца Светлагорская цэнтральная раённая бальніца. За апошнія два гады на набыццё медыцынскага абсталявання выдаткавана каля Br12 млрд. З кастрычніка тут пачало працаваць аддзяленне рэабілітацыі.

— Вы нядаўна кіруеце Светлагорскім раёнам — што пабачылі свежым поглядам? Ці магчыма «раскруціць» рэгіён як турыстычны аб'ект?

— Пакуль што ў Светлагорску не хапае аб'ектаў гандлю. Забяспечанасць гандлёвымі плошчамі на 1000 жыхароў складае 456 кв. м пры нарматыве 600 кв.м. За студзень—верасень на тэрыторыі раёна ўведзены ў эксплуатацыю чатыры гандлёвыя цэнтры. Запрацавалі буйныя сеткавыя фарматы. Адкрыты тры аб'екты грамадскага харчавання. Да канца года плануем запусціць яшчэ два гандлёвыя цэнтры. Наш горад зусім малады, налета яму споўніцца 55 гадоў. Разам з тым, гэта вялікі індустрыяльны цэнтр, у якім знаходзіцца 14 буйных і сярэдніх прадпрыемстваў. Мае папярэднікі тут сабралі каманду кіраўнікоў-прафесіяналаў, з якой прыемна працаваць. Апошні культурны аб'ект, увасабленнем якога ганарацца ўсе жыхары Светлагорскага раёна, — мемарыяльны комплекс, прысвечаны аперацыі «Багратыён». Ён быў адкрыты ля вёскі Ракавічы летась, а сёлета побач створаны ваенны музей. Вось сюды, лічу, трэба прыязджаць, каб ушаноўваць памяць нашых продкаў і лепш вывучаць гісторыю сваёй зямлі. Вядома, на Светлагоршчыне шмат месцаў з прыгожымі краявідамі, ёсць ідэальныя ўмовы для стварэння ў райцэнтры прыгожага парку з атракцыёнамі. Спадзяёмся, што праз пэўны час і гэтая мара здзейсніцца.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*. **Фота аўтара**

СТВОРЫМ КРАІНЕ ІМІДЖ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Папулярнымі становяцца і падарожжы па «зялёных маршрутах», у тым ліку і па гістарычных мясцінах, якія пакідаюць незабыўнае ўражанне. Спецыялісты адзначаюць, што попыт на паслугі нашых сядзіб расце. Сёння да нас часта прыязджаюць турысты з Заходняй Еўропы, ЗША, Канады і нават Аўстраліі. Асноўнай задачай арганізатараў з'яўляецца ўдасканаленне якасці сэрвісу.

Куды рухацца далей?

Дырэктар дэпартамента па турызме Міністэрства спорту Вадзім КАРАМЗІН распавёў, што да канца года ў краіне з'явіцца яшчэ больш за 170 сядзіб. І гэта нягледзячы на тое, што для турыстычнай сферы сённяшняе эканамічнае становішча, мякка кажучы, не самае спрыяльнае.

«Сёння аграрызм найменш схільны да дэвальвацыйных ваганняў. Падзенне даходаў турарганізацый за год склала каля 40%. У аграрызме гэты працэнт застаўся на ўзроўні мінулага года», — адзначыў ён.

Каля 60% аграсядзіб спецыялізуюцца на прадастаўленні паслуг у сферы культуры і традыцый (вясковыя святы, рамёствы), актыўнага адпачынку (байдаркі, веламаршруты) і экскурсій, якія знаёмяць з працэсамі вытворчасці ў сельскай гаспадарцы. У выніку ўласнікі сядзіб стварылі 6 тысяч новых працоўных месцаў на вёсцы. Таксама створаны ўмовы для размяшчэння турыстаў у 98% раёнаў Беларусі. Пачынаюць прасоўваць аграрызм і ў інтэрнэце. За апошні час распрацавана больш за дзясятак сайтаў. Вадзім Карамзін адзначыў, што цяпер аформіліся перспектыўныя напрамкі развіцця аграэкатурызму. Плануецца ўладкаваць больш «зялёных маршрутаў» з наведваннем прыгожых мясцін, палепшыць арганізацыю тураў, звязаных з дэгустацыяй нацыянальных страў, стварыць сетку спартыўных турыстычных маршрутаў. Не абмінуць і культурную спадчыну з усімі наяўнымі славутасцямі.

Створаны ўсе ўмовы

З боку фінансавых інстытутаў для арганізацыі бізнесу ў гэтай сферы ёсць мноства прэферэнцый. У Агрmaпрамбанка, які курыруе аграгурызм у Беларусі, дастаткова проста аформіць крэдыт пад мінімальны працэнт. Умовы крэдытавання за 8 гадоў практычна не змяніліся — працэнтная стаўка 5% гадавых на тэрмін да 7 гадоў для фізічных асоб, для сельскіх арганізацый да 5 гадоў. Акрамя таго, усіх ахвотных нават навучаць, як весці бізнес у спецыяльным навучальным цэнтры ў Мінску. Развіваюць і сістэму безнаяўных разлікаў. Тэрмінальнае абсталяванне для кліентаў банка ўсталёўваюць бясплатна. Таксама збіраюцца ўкараняць функцыю аплат анлайн, што за мяжой з'яўляецца нормай. У сферу ўжо сёння рыхтуюцца маладыя кадры — у БДУ ёсць спецыялізацыя па аграэкатурызме.

Як відаць, сельскаму турызму надаецца вялікая ўвага, бо, можна сказаць, сёння гэта асноўны каталізатар для развіцця сельскай мясцовасці. Ёсць прыклады, калі ініцыятыва некалькіх чалавек дазволіла арганізаваць сур'ёзны бізнес. Сюды можна аднесці вядомую Налібоцкую пушчу, дзе знаходзіцца мноства прыватных сядзіб, куды сёння спяшаюцца трапіць замежныя турысты.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Не дранікам адзіным!

Адным з самых цікавых і смачных напрамкаў у аграгурызме з'яўляецца так званы гастранамічны турызм. Варта сказаць, што гаворка ідзе далёка не пра беларускія дранікі, бо кулінарная спадчына нашых продкаў нашмат больш разнастайная і багатая, чым можа здацца на першы погляд. Ды і сучасная вытворчасць выдзяляецца сваёй якасцю. Спецыялісты прапануюць увязаць рэгіёны з той ежай, якая там вырабляецца. Напрыклад, мазырская каўбаса, глыбоцкая згушчонка і гэтак далей. Гэта дазволіць стварыць кулінарную карту Беларусі. Арганізатары імкнуцца да таго, каб турыст перад тым, як вырашыць, куды ехаць, змог знайсці ў інтэрнэце або купіць друкаваны варыянт карты, дзе будуць усе магчымыя кулінарныя маршруты. Такім чынам, ён загадзя даведаецца, чым хоча пачаставацца і куды яму трэба будзе паехаць. Пакуль што гэта толькі распрацоўкі, але ў Беларусі ўжо сёння ёсць вялікая колькасць гастранамічных фестываляў. Да іх, ды і да беларускай кухні, неабходна прывучаць не толькі турыстаў, але і беларускую моладзь, якая, згодна з даследаваннямі, мала наведвае рэстараны нацыянальнай кухні. Перад беларускімі арганізатарамі стаіць няпростая задача зрабіць яе больш даступнай па цане і разнастайнасці, адыходзячы пры гэтым ад, скажам, знаёмым усіх дранікаў. Ды і канкураваць з фаст-фудам таксама няпроста.

Выклік прыняты!

Як адзначыў **прэзідэнт літоўскай асацыяцыі сельскага турызму Лінас ЖАБАЛЮНІС**, для таго, каб паспяхова развіваць аграгурызм, яго трэба зрабіць больш спецыялізаваным.

«Прадавец павінен ведаць, што ён прадае і на каго гэта разлічана. Кліент павінен ведаць, навошта ён едзе менавіта ў гэтую сядзібу», — адзначыў ён.

Пасля таго, як арганізатар вызначыцца з прадуктам, важным застаецца доступ да яго. А гэта і рэклама, і выкарыстанне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

«Мы правялі даследаванні, дзякуючы якім высветлілі, што сярэдні кліент сёння мае ўніверсітэцкую адукацыю, ва ўзросце 21-50 гадоў мае сярэдні даход і падарожнічае з сям'ёй і дзецьмі. Ён з'яўляецца актыўным карыстальнікам смартфона. Гэта азначае, што трэба адаптаваць сістэму заказаў пад смартфон. Каб патэнцыйны наведвальнік мог за 3 «клікі» забраніраваць нумар», — растлумачыў Лінас Жабалюніс.

Што тычыцца сярэдняга ўладальніка сядзібы, то ён ахарактарызаваў яго так: жыхар сельскай мясцовасці ва ўзросце 40-50 гадоў, які заходзіць у інтэрнэт не больш за 3 разы на тыдзень.

«Як мы можам зарабіць, калі кліент на шмат крокаў наперадзе нас? Персанальны сэрвіс і гасціннасць — вялікая перавага для аграгурызму. Аднак інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі — гэта ўсё яшчэ выклік», — падкрэсліў кіраўнік літоўскай асацыяцыі сельскага турызму.

Пагодзімся з ім.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
Kryzhevich@zviazda.by

ДРУГІЯ Ў СВЕЦЕ

Дарэчы, Беларусь сёлета заняла другое месца ў намінацыі «Аграгурызм» па версіі National Geographic Traveler. Часопіс правёў конкурс на найлепшыя турыстычныя напрамкі сярод самых папулярных відаў адпачынку — National Geographic Traveler Awards 2015.

Анлайн-галасаванне прайшло з 29 чэрвеня па 10 лістапада ў 18 намінацыях: «Пляжны адпачынак», «Сямейны адпачынак», «Гарналыжны адпачынак», «Экскурсійны адпачынак», «Аграгурызм», «Аздараўленчы адпачынак», «Экаадпачынак», «Прыгодніцкі адпачынак», «Расійскі турызм», «Адкрыццё года», «Гастранамічны турызм», «Экзатычны адпачынак». У намінацыі «Аграгурызм» за Беларусь было аддадзена 22% галасоў. Апярэдзіла нашу краіну толькі Італія з 26%. Славакія набрала 20%, далей ідуць Малдова з 18%, Расія з 9%, Сербія з 8%, Аўстралія з 4% і Літва з 3%. Беларусь таксама была прадстаўлена ў намінацыях «Сямейны адпачынак» і «Аздараўленчы адпачынак» і ў абодвух выпадках атрымала 3%.

ЗАЎСЁДЫ НА СУВЯЗІ

У краіне працягваюць працу прамыя тэлефонныя лініі

Задаць свае пытанні можна кожную суботу з 9 раніцы да паўдня. Па традыцыі, на званкі адказваюць старшыні гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, іх намеснікі і кіраўнікі спраў.

Такую форму працы са зваротамі сталі практыкаваць у пачатку года. За гэты час тэлефонны званок стаў сапраўдным гарантам рашэння любой праблемы.

У гэтую суботу, 28 лістапада, на сувязь з жыхарамі краіны выйдуць:

Брэсцкі аблвыканкам —
Токар Мікалай Васільевіч, першы намеснік старшыні (80162213121);

Віцебскі аблвыканкам —
Шарстнёў Мікалай Мікалаевіч, старшыня (80212204260);

Гомельскі аблвыканкам —
Максіменка Аляксандр Уладзіміравіч, першы намеснік старшыні (80232751237);

Гродзенскі аблвыканкам —
Жук Ігар Георгіевіч, старшыня абласнога Савета дэпутатаў (80152735644);

Мінскі аблвыканкам —
Макар Ігар Мікалаевіч, першы намеснік старшыні (80175004160);

Магілёўскі аблвыканкам —
Малашка Валерый Анатольевіч, намеснік старшыні (80222501869);

Мінскі гарвыканкам —
Лапцеў Віктар Сяргеевіч, намеснік старшыні (80172224444).

■ Ідэі і людзі

НОВАЕ Ў НАВУКОВЫМ АСЯРОДДЗІ: ВЕКТАРЫ ПОШУКУ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

У Маскве, у Дзелавым і культурным комплексе Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, пачаў сваю работу экспертна-медыйны форум-семінар «Вектары развіцця навуковага асяроддзя ў Саюзнай дзяржаве. Новыя ідэі і людзі». Нароўні з Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы арганізатарам гэтага творчага медыйнага праекта выступіла Міжнароднае інфармацыйнае агенцтва «Россия сегодня». Да ўдзелу ў форуме запрошаны вядомыя вучоныя, кіраўнікі СМІ і вядучыя аглядальнікі.

З вітальным словам да ўдзельнікаў дыскусій звярнуўся дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота.

Сярод спікераў форуму — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі Ігар Петрышэнка, сустаршыня Міжакадэмічнага савета па праблемах развіцця Саюзнай дзяржавы, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Пётр Віцязь, віцэ-прэзідэнт Расійскай акадэміі навук, акадэмік РАН Анатоль Грыгор'еў, намеснік кіраўніка Федэральнага агенцтва навуковых арганізацый Расійскай Федэрацыі Аляксей Лапацін. Работа форуму-семінара ідзе па секцыях: «Перспектывы развіцця прамысловасці Саюзнай дзяржавы на базе высокіх тэхналогій», «Сучасныя тэндэнцыі ў геннай інжынерыі», «Як прымусіць інавацыі працаваць?», «Брэнд «Прадукцыя Саюзнай дзяржавы» і іншых. Таксама адбудзецца «круглы стол» на тэму «Навуковая журналістыка: прафесіяналізм, дакладнасць, асаблівасці».

Кірыл ЛАДУЦЬКА,
г. Масква, Расійская Федэрацыя

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

25 лістапада 2015 г. № 22 (362)

ПАЕХАЛІ!

ЗАКАЛЬЦАВАЦЬ... ЖОДЗІНА

Горад імкнецца стаць лідарам па развіцці веласіпеднай інфраструктуры

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

Гістарычна жыхары Жодзіна ставяцца да веласіпеда як да зручнага і эканамічнага транспарту. Раней, бадай, ці не ўсе ездзілі на ім за горад, на дачу, рэчку, возера, у лес па ягады і грыбы. Ды з цягам часу паляпшаўся сямейны дабрабыт, многія абзавяліся асабістымі аўтамабілямі, а веласіпеды, так бы мовіць, састарэлі. Але, як той казаў, нічога больш даступнага і практычнага, чым веласіпед, чалавецтва пакуль не вынайшла. Апошнім часам у гараджан зноў з'явілася цікавасць да гэтага сродку перасоўвання. А мясцовыя ўлады пачынанне толькі падтрымліваюць і стымулююць.

Жодзіна імкнецца стаць лідарам у краіне па стварэнні інфраструктуры веласіпеднага транспарту, — кажа **старшыня гарадскога Савета дэпутатаў Наталля СУШКО**. — Першы крок да гэтага ўжо зроблены — у цэнтры горада адкрыта веласіпеднае кольца. Яно пралегла ўздоўж вуліц 40 гадоў Кастрычніка, праспекта Міра, вуліцы 50 гадоў Кастрычніка і праспекта Леніна. Агульная працягласць маршруту — больш як два кіламетры. Паколькі няма магчымасці вылучыць для арганізацыі руху праезную частку дарогі, то прынялі рашэнне падзяліць тратуар (даволі шырокі — больш як 4 метры) на дзве часткі: для пешаходаў і веласіпедыстаў. Зоны абазначылі адпаведнай разметкай, дарожнымі знакамі.

Створана таксама 6 парковак для часовага захоўвання веласіпедаў (у тым ліку тры крытыя — каля сацыяльна значных аб'ектаў): Цэнтра дзіцячай творчасці, Цэнтральнай гарадской бібліятэкі, на тэрыторыі гарадскога пляжа, Маладзёжнага цэнтра, гімназіі №1, у раёне гандлёвага цэнтра. Прычым яны прадугледжваюць магчымасць для захоўвання ўсіх відаў «жалезных» коней.

Шмат увагі надаецца папулярызацыі здаровага ладу жыцця, веласіпеднага руху сярод жыхароў горада. Іх вучаць правілам бяспечных і культурных паводзін на дарогах, прапагандуюць веласіпед як экалагічна чысты від транспарту.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ВЯЛІКАЕ ПЕРАСЯЛЕННЕ

З РЭЧАМІ НА ВЫХАД!

Як можна страціць жытло праз няплату за паслугі ЖКГ

Нядаўна ў Мінску дзве сястры вымушаны былі пакінуць сваю трохпакаёвую кватэру і пераехаць у адзін невялікі пакой. Жанчыны завінавацілася за камунальныя выгоды 4,2 млн рублёў. Гісторыя не новая, але, хочацца спадзявацца, павучальная.

Важная не сума, а тэрмін

Сёстры (27 і 33 гады) пастаянна спрачаліся паміж сабой аб тым, хто павінен аплачваць камунальныя паслугі. Пасля сумеснага ўжывання алкагольных напояў апаненты сыходзіліся на думцы, што выдаткі... абавязаны ўзяць на сябе іх старэйшы брат. Вось толькі ён быў супраць такога рашэння, і зразумела, чаму: мужчына даўно ў гэтай кватэры не жыў і не быў прапісаны.

Спрэчкі доўжыліся больш за шэсць месяцаў, і за гэты час доўг за «камуналку» ўсё павялічваўся... Завяршылася сітуацыя сумна для канфліктуючых бакоў. Па рашэнні суда сёстрам давялося пакінуць прасторную кватэру. Узамен ім далі памяшканне ў 16 кв. м.

Як адзначылі ў ЖРЭА Кастрычніцкага раёна, былі прыклады, калі высялялі і пры доўгу ў 800 тысяч рублёў. Тут важная не сума, а перыяд няплаты. Наймальнікам, якія маюць запазычанасць у 6 перыядаў (месяцаў), адпраўляюць пісьмовае прадпісанне аб неабходнасці пагашэння доўгу. У выпадку нявыплаты ЖРЭА мае права звярнуцца ў суд з патрабаваннем аб высяленні даўжніка з жылога памяшкання. Узамен яму прадастаўляецца іншае, меншае па плошчы або горшае па сваіх спажывецкіх якасцях, у тым ліку за межамі горада.

Па індывідуальнай праграме

Нават калі кватэра прыватызаваная, то ад высялення гэта не ўратуе: у Жыллёвым кодэксе ёсць адпаведны артыкул. Аднак кожны выпадак патрабуе індывідуальнага падыходу.

— Высяляць за няплату за жыллёва-камунальныя паслугі ці не — вырашае суд. Увогуле няма адзінага дакумента, які вызначае, каго высяляць, а каго — не, гэта ўсё вызначаецца ў індывідуальным парадку, — тлумачыць **намеснік гендырэктара па ідэалагічнай працы Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі Аляксей ГЕРАСІМЧЫК.** — Ёсць указ, у якім прапісана, што не высяляюць сірот. Шматдзетную сям'ю не могуць выселіць з агульнай кухні, але з трохпакаёвай кватэры — могуць. Аднак усё гэта вельмі індывідуальна.

З чым звязаны рост і спад запазычанасцяў, у МГЖГ сказаць не могуць: гэтая лічба пастаянна змяняецца. Напрыклад, калі ў ліпені адзначаецца рост, то ў жніўні ён можа спыніцца, а ў наступным месяцы запазычанасць зноў павялічваецца.

— 80% неплацельшчыкаў — гэта людзі, якія не плацяць за жыллёва-камунальныя паслугі да двух месяцаў. І ў гэту катэгорыю трапляюць абсалютна розныя грамадзяне: напрыклад, чалавек паехаў у камандзіроўку, таму і не заплаціў.

Згаданая група неплацельшчыкаў для сталічных камунальнікаў, па словах Аляксея Герасімчыка, найбольш праблемная, таму што існуе вельмі мала рычагоў уплыву на яе. Па сутнасці — толькі званкі, угаворы і пастаянныя нагадванні пра неабходнасць аплаціць паслугі. Таму што прыпыніць іх аказанне можна толькі пасля двух месяцаў няплаты.

> Нават калі кватэра прыватызаваная, то ад высялення гэта не ўратуе.

Злосных жа неплацельшчыкаў у Мінску не так шмат — усяго 4,5% ад агульнай колькасці асабовых рахункаў. Да нядаўняга часу амаль ніякіх мер уздзеяння да іх прымяніць не маглі. Цяпер, калі з'явілася магчымасць высялення, праблема ўсё роўна не вырашана да канца: ну прымусяць чалавека з'ехаць у які-небудзь закінуты пакойчык, а далей што? Жылец як не плаціў за ваду і электрычнасць, так і не будзе. І тут нават адключэнні не ратуюць, бо многія прыстасоўваюцца жыць і без камунальных выгод. Не выкідаць жа людзей на вуліцу. І выправіць такіх таксама наўрад ці атрымаецца. Падчас рэйду па кватэрах даўжнікоў са спецыялістамі разліковага цэнтра заўважыла цікавую акалічнасць. Большасць тлумачыць няплату тым, што яны нідзе не працуюць і лічаць гэта «жалезабетонным» апраўданнем. Калі ж прадстаўнікі разліковай арганізацыі асцярожна прапаноўвалі беспрацоўным магчымыя варыянты працаўладкавання, у адказ чулі абуральныя выбухі: «Ды я на такую работу за такія грошы ў жыцці не пайду!» Зрэшты, дэкрэт «аб утрыманстве» прыгасіў многія амбіцыі. Многія, ды не ўсе...

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
seradzyuk@zviazda.by

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Сёлета ў Мінску, па звестках Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі, у суды пададзена 22 іскі аб высяленні неплацельшчыкаў камунальных паслуг з арэндных кватэр, з іх 9 задаволеныя.

Усяго з 2013 года ў сталіцы выселілі 32 злосных неплацельшчыка за паслугі ЖКГ. З іх у кватэры горшых спажывецкіх якасцяў пераехалі 24 чалавекі.

На пачатак лістапада запазычанасць за жыллёва-камунальныя паслугі ў сталіцы склала 9,9 млрд рублёў. Цяпер у горадзе налічваецца 24 506 асабовых рахункаў з пратэрмінаванай запазычанасцю за жыллёва-камунальныя паслугі. З іх 23 тысячы маюць запазычанасць да трох месяцаў на суму 6,9 млрд рублёў. Больш за тры гады не аплачваюць камунальныя паслугі 57 спажыўцоў. Сума іх доўгу складае 400 млн рублёў.

Пратэрмінаваная запазычанасць за жыллёва-камунальныя паслугі ў сталіцы з пачатку года вырасла на 1,5 млрд рублёў.

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

«ЗА ПАПЕРАЙ ЧАЛАВЕКА НЕ ПАБАЧЫШ»

Горад Горкі вядомы беларусам як горад студэнтаў — у ім знаходзіцца Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія. Ці дабаўляе гэта турбот уладам? Па словах Міхаіла ВОЛКАВА, дэпутата ад Горацкай выбарчай акругі №82, члена Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па аграрнай палітыцы, — адначасова і так, і не. Спецыяльна для «МС» Міхаіл Міхайлавіч расказвае пра асаблівасці свайго раёна і работу з яго жыхарамі.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

ДАВОДЗІЦЦА МІРЫЦЬ

Спектр пытанняў, з якімі звяртаюцца людзі да Міхаіла Волкава, вельмі шырокі. Пачынаючы ад ЖКГ і заканчваючы асабістымі праблемамі, нават урэгуляваннем сямейных пытанняў. «Не раз даводзілася мірыць мужа і жонку», — прызнаецца дэпутат і дадае, што вырашаць міжасобасныя канфлікты даволі складана, яшчэ і вінаватым можна застацца. Але большасць пытанняў грамадзян звязана з ЖКГ і рамонтам дарог. Хоць часам людзі прыходзяць з прапановамі вынесці набалелае для іх пытанне на заканадаўчы ўзровень.

— Людзям здаецца, што ў дэпутата ёсць чарадзейная палачка, ён узмахне ёю — і ўсё вырашыцца, — дзеліцца Міхаіл Міхайлавіч. — Хоць перш за ўсё вырашэнне надзённых праблем залежыць ад мясцовых улад. Таму трэба ўзаемадзейнічаць спачатку з імі.

На прыём да дэпутата прыходзяць людзі ўсіх узростаў: ад 15 гадоў і далей — без абмежаванняў. «У мяне быў цікавы выпадак, — расказвае Міхаіл Волкаў. — Я прыехаў у адну з вёсак нашага раёна. На прыём прыйшло тры чалавекі. Апошнім зайшоў мужчына пенсійнага ўзросту. Мы з ім паўгадзіны гутарылі, ён расказаў пра сваё жыццё. Нарэшце я кажу: «А ў чым пытанне?». І ён адказвае: «Ды не ў чым. Я прыйшоў пагаварыць». Узгадваю гэта з цеплынёю, бо размова атрымалася душэўная і цікавая».

